## Ігар МАРЗАЛЮК:

# «Для нас важна захаваць незалежную, суверэнную Беларусь»

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігара МАРЗАЛЮКА**, тое, што Усебеларускі народны сход збіраецца ў канстытуцыйным статусе, сведчыць, што Беларусь, нягледзячы на ўсе «экспертныя» ацэнкі, спакойна развіваецца, шукае свой шлях, сваю адметнасць і будуе сваю мадэль сацыяльна-палітычнага ладу. «Гэта яшчэ адзін вельмі важны этап у навейшай гісторыі Беларусі, які сведчыць аб тым, што мы змяняем сваю сістэму і пераходзім на новы якасны этап развіцця беларускага народаўладдзя, які абапіраецца на вялікую традыцыю — ад Полацкага веча, Усебеларускага сходу 1917 года, народнага сходу 1939 года ў Беластоку да традыцыі УНС, якая была распачата ў незалежнай Беларусі, — падкрэсліў дэпутат. — Самае галоўнае, што мы пераўтвараем сваю дзяржаву, зыходзячы з уласных уяўленняў, уласных традыцый, нікога не капіруючы, выбудоўваючы тое, што для нас важна. А для нас важна, як неаднойчы казаў Прэзідэнт, захаваць незалежную, суверэнную Беларусь. Гэта яшчэ адзін крок да поўнай, моцнай, незалежнай краіны, да таго, каб Беларусь выйшла на новы ўзровень — сацыяльны, эканамічны, палітычны і культурны».

